КОМИТЕТ ПО ОБРАЗОВАНИЮ МИНГОРИСПОЛКОМА

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИНСТИТУТ РАЗВИТИЯ ОБРАЗОВАНИЯ

ВЫСТАВОЧНОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ "ЭКСПОФОРУМ"

# Открытая международная научно-практическая конференция

# ДОРОЖНАЯ КАРТА ИНФОРМАТИЗАЦИИ: ОТ ЦЕЛИ К РЕЗУЛЬТАТУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## тезисы докладов

Комитет по образованию Мингорисполкома

Минский городской институт развития образования

ЭКСПОФОРУМ выставочное предприятие www.expoforum.b y

Минск, 2016

Комитет по образованию Мингорисполкома
ГУО «Минский городской институт развития образования»
Унитарное предприятие «Экспофорум»

# ДОРОЖНАЯ КАРТА ИНФОРМАТИЗАЦИИ: ОТ ЦЕЛИ К РЕЗУЛЬТАТУ

*Тезисы докладов*
*открытой Международной научно-практической конференции*
*(11 февраля 2016 г., г. Минск, Беларусь)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
МГИРО
2016

УДК 37.091.33-028.27(043.2)
ББК 74.04 я43
Д 69

*Рекомендовано к изданию редакционно-издательским советом*
*Минского городского института развития образования*

Под общей редакцией
*Т. И. Мороз,*
ректора ГУО «Минский городской институт развития образования»,
кандидата педагогических наук, доцента.

Рецензенты:
*О. В. Толкачева, Н. Л. Кузьминич, Б. В. Пальчевский,*
*Т. О. Пучковская, О. М. Старикова.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Д 69 **Дорожная карта информатизации:** от цели к результату : тезисы докладов открытой Междунар. науч.-практ. конф. (11 февр. 2016 г., г. Минск, Беларусь) / под. общ. ред. Т. И. Мороз. – Минск : МГИРО, 2016. – 164 с.
ISBN 978-985-6864-40-0.

Сборник содержит тезисы докладов участников открытой Международной научно-практической конференции, посвященной проблемам использования информационных технологий в образовании.

Адресуется научным работникам, педагогам, руководителям учреждений образования и органов управления образованием, специалистам системы образования, системным администраторам.

Ответственность за содержание опубликованных материалов несут авторы.

**УДК 37.091.33-028.27(043.2)**
**ББК 74.04 я43**

**ISBN 978-985-6864-40-0**

© ГУО «Минский городской институт развития образования», 2016

## ДЫДАКТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ІНТЭРАКТЫЎНАЙ ДОШКІ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ МЕТАДЫЧНЫХ НАПРАМКАЎ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ

***В. У. Зелянко,***
*кандыдат педагагічных навук, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», дацэнт кафедры прыватных методык*
***Н. В. Быстракова, І. А. Турчанка,***
*Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», старшыя выкладчыкі кафедры прыватных методык*

Сярод сучасных электронных сродкаў навучання шырокае распаўсюджанне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі атрымала інтэрактыўная дошка. Гэта тлумачыцца яе адметнымі дыдактычнымі магчымасцямі і багатым арсеналам функцый, у ліку якіх – мультымедыя (перадача тэкставай, графічнай інфармацыі, узнаўленне відэа- і аўдыяфайлаў); сэнсарны экран (кіраванне праз экран дошкі); паліграфічныя прыёмы работы з тэкстам (выдзяленне колерам, курсівам, падкрэсліванне) і інш. [1, с. 90].

Выкладчыкамі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ Н. В. Быстраковай, В. У. Зелянко, І. А. Турчанка створаны вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская арфаграфія: інтэрактыўны



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

практыкум» (праграма Smart Notebook), які дазваляе ў інтэрактыўным рэжыме ўзнавіць веды, замацаваць уменні і навыкі вучняў па арфаграфіі, удасканаліць камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціню, багацце, выразнасць, дарэчнасць).

Дапаможнік складаецца з інтэрактыўных модуляў («Правапіс галосных *о, э, а*»; «Правапіс галосных *е, ё, я*»; «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах» і г.д.) і прызначаны для выкарыстання на вучэбных занятках у V класе (раздзел «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія»), VI класе (раздзел «Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія»), VII–IX класах (развіццё і ўдасканаленне арфаграфічнай пісьменнасці пры вывучэнні марфалогіі і сінтаксісу), а таксама на факультатыўных занятках.

Змест інтэрактыўных модуляў вучэбна-метадычнага дапаможніка арыентаваны на рэалізацыю фанетыка-арфаэпічнага, марфеміка-аналітычнага, этымалагічнага і лексіка-семантычнага напрамкаў у навучанні беларускай арфаграфіі.

*Фанетыка-арфаэпічны напрамак* у навучанні арфаграфіі абумоўлены вядучым прынцыпам беларускага правапісу – фанетычным, у адпаведнасці з якім напісанне слова адпавядае яго літаратурнаму вымаўленню. Выпрацоўка ў вучняў арфаграфічнай пісьменнасці немагчыма без асэнсаванага стаўлення да гукавога складу слова, авалодання нормамі літаратурнага вымаўлення. Кожны інтэрактыўны модуль вучэбна-метадычнага дапаможніка змяшчае рубрыку «*Гавары і пішы правільна*», якая акцэнтуе ўвагу вучняў на нарматыўным вымаўленні пэўных гукаў, спалучэнняў гукаў, слоў і спрыяе прадухіленню арфаграфічных памылак.

Напрыклад, пры напісанні папераджальнага зрокавага дыктанта (інтэрактыўны модуль «Правапіс галосных *о, э, а*») вучні знаёмяцца з наступнай інфармацыяй: «Назоўнікі жаночага роду тыпу *вада, рука* ў вінавальным склоне адзіночнага ліку, як і ў іншых склонах адзіночнага ліку, маюць націск на канчатку: *вадá – вадý, нагá – нагý, галавá – галавý, гарá – гарý, шчакá – шчакý*» [2, с. 60-61], што дазваляе папярэдзіць арфаграфічныя памылкі, абумоўленыя ненарматыўнай пастаноўкай націску: ***вóду, нóгу*** замест ***вадý, нагý***.

Пры выкананні задання на ўстанаўленне адпаведнасці паміж фразеалагізмамі *без году тыдзень, як без рук, не лезе ў рот, зімой снегу не выпрасіш* і іх значэннямі (інтэрактыўны модуль «Правапіс галосных *е, ё, я*») увага вучняў звяртаецца на тое, што ў першым пераднаціскным складзе гук [э] ў часціцы *не* і прыназоўніку (прыстаўцы) *без* вымаўляецца як [а] незалежна ад таго, як яны пішуцца – разам ці асобна: [*н'а*]*смачны*, [*б'аз*]*рыб'е*, [*н'а*] *ведаў*, [*б'аз*] *рыбы* [2, с. 29]. Гэтыя звесткі дазваляюць пазбегнуць арфаграфічных памылак тыпу ***бяз** году тыдзень, **ня** лезе ў рот* (замест *без году тыдзень, не лезе ў рот*), а таксама арфаэпічных памылак, што могуць узнікнуць пад уплывам «нефанетычных» напісанняў: [*б'эз*] *году тыдзень*, [*н'э*] *лезе ў рот* (замест [*б'аз*] *году тыдзень*, [*н'а*] *лезе ў рот*). Акрамя таго, пры націсканні на фразеалагізм вучні могуць пачуць яго нарматыўнае вымаўленне.

*Марфеміка-аналітычны напрамак* у навучанні арфаграфіі грунтуецца на марфалагічным прынцыпе беларускага правапісу, згодна з якім на пісьме захоўваецца графічнае адзінства марфем (каранёў, прыставак, суфіксаў, канчаткаў) ва ўсіх формах слова і аднакаранёвых словах. Умовай засваення вучнямі напісанняў, заснаваных на марфалагічным прынцыпе, з'яўляецца ўменне правільна выдзяляць у слове марфемы, без чаго «многія арфаграфічныя правілы страчваюць сваю практычную сілу» [3, с. 6].

Так, з мэтай засваення правапісу звонкіх і глухіх зычных вучням прапануецца запісаць выдзеленыя ў прыказках словы згодна з арфаграфічнымі нормамі: *Госця вясною частуюць **мя[т]ком**, а ўвосень – малачком. Няпрошанаму госцю **лы[ш]кі** няма. Дарагі не **абе[т]**, а прывет. Каб у хлеве – парсюк **гла[т]кі**, а на стале – каб смачныя **ала[т]кі**.*

Выкананне гэтага задання грунтуецца на ўменнях вучняў устанаўліваць семантычную сувязь слова з аднакаранёвымі словамі, выбіраць сярод аднакаранёвых слоў або форм слова праверачнае – тое, у якім гук, што трэба абазначыць на пісьме, знаходзіцца ў моцнай пазіцыі: *мядком – мядок, лыжкі – лыжак, абед – абедаць* і г.д. Пры націсканні на слова, якое патрабуецца запісаць у адпаведнасці з арфаграфічнай нормай, з'яўляецца яго правільнае напісанне.

*Этымалагічны напрамак* у навучанні арфаграфіі забяспечвае ўсвядомленае засваенне вучнямі традыцыйных напісанняў на аснове іх этымалагічнай матывацыі. Інтэрактыўныя модулі вучэбна-метадычнага дапаможніка ўключаюць рубрыку «*Біяграфія слова*», дзе прыводзіцца этымалагічная інфармацыя, якая дапамагае вучням зразумець, што ў арфаграфічным «абліччы» слова нярэдка знаходзіць адбітак гісторыя яго ўзнікнення. Напрыклад, пры вывучэнні правапісу звонкіх і глухіх зычных вучні знаёмяцца з наступнай этымалагічнай даведкай: «Слова *айсберг* запазычана з нямецкай мовы (*Eisberg*), куды прыйшло са скандынаўскіх моў (*isberg*). Скандынаўскае *isberg* паходзіць ад *is* 'лёд' (параўнайце: *Ісландыя* 'лядовая краіна') і *berg* 'гара' (такі ж корань мае слова *бераг*)» [4, с. 11]. Як вынік, вучні прыйдуць да высновы, што праверыць напісанне літары *с* у слове *айсберг* можна шляхам падбору праверачнага слова *Ісландыя*, напісанне літары *е* – словам *бераг*.

*Лексіка-семантычны напрамак* у навучанні арфаграфіі абумоўлены ўзаемасувяззю арфаграфіі і лексікалогіі, што выяўляецца найперш у сэнсаадрознівальнай функцыі дыферэнцыйных напісанняў, якія дазваляюць размяжоўваць семантыку слоў-амонімаў. У рубрыцы «*Правільнасць маўлення*» раскрываецца семантыка амонімаў, паронімаў, што ўжываюцца ў практыкаваннях вучэбна-метадычнага дапаможніка (*ордэн – ордар, сядзіба – сяліба* і інш.). Акрамя таго, інтэрактыўныя модулі змяшчаюць старонку «Тлумачальны слоўнік», да якой вучні могуць звярнуцца праз гіперспасылку, каб высветліць лексічнае значэнне выдзеленых у тэкстах слоў.

Такім чынам, выкарыстанне ў адукацыйным працэсе вучэбна-метадычнага дапаможніка «Беларуская арфаграфія: інтэрактыўны практыкум», які прадугледжвае работу з інтэрактыўнай дошкай, забяспечвае рэалізацыю фанетыка-арфаэпічнага, марфеміка-аналітычнага, этымалагічнага і лексіка-семантычнага

напрамкаў у навучанні арфаграфіі, спрыяе ўсведамленню вучнямі таго, што арфаграфічная пісьменнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў маўленчай і агульнай культуры асобы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Гусакова, Е. М. Электронная интерактивная доска: программное обеспечение и технические характеристики, влияющие на эффективность обучения / Е.М. Гусакова // Интеграция образования. – 2013. – № 1. – С. 89-93.
2. Янкоўскі, Ф. М. Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф. М. Янкоўскі. – 4-е выд. – Мінск : Народная асвета, 1976. – 94 с.
3. Разумовская, М. М. Грамматический анализ при обучении орфографии : пособие для учителя / М. М. Разумовская. – М. : Учпедгиз, 1962. – 76 с.
4. Шанский, Н. М. Школьный этимологический словарь русского языка : происхождение слов / Н. М. Шанский, Т. А. Боброва. – 6-е изд. – М. : Дрофа, 2003. – 400 с.

## СЕТЕВОЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ УЧАСТНИКОВ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА КАК СРЕДСТВО ФОРМИРОВАНИЯ ИХ ПСИХОЛОГИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

***О. А. Иванашко,***
*ГУО «Гимназия № 27 г. Минска», педагог-психолог*

Стремительное развитие информационно-коммуникационных технологий и появление новых возможностей их использования в образовании побуждает искать новые, современные подходы к организации процесса обучения на основе сетевого взаимодействия.

В соответствии с Концепцией непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи одним из основных составляющих воспитания является «воспитание психологической культуры, направленной на развитие и саморазвитие личности» [1, с. 29].

Актуальность формирования психологической культуры участников образовательного процесса обусловлена ее ведущей ролью в процессах жизнедеятельности человека, его общения, социальной адаптации, продуктивного личностного развития.

Психологическая культура личности не формируется без психолого-педагогических и социальных условий. Одним из средств формирования психологической культуры являются социальные сетевые сервисы, которые открывают широкие возможности в практической деятельности педагога-психолога, органично дополняют традиционные формы работы, расширяя возможности взаимодействия со всеми участниками образовательного процесса.

Сетевое взаимодействие участников образовательного процесса ГУО «Гимназия № 27 г. Минска» организовано посредством ресурса «Психологический блогомир» (http://psi-blogomir.blogspot.com.by), в качестве среды разработки которого был выбран web-сервис Blogger. Основная страница ресурса представлена в виде четырех блогов: блог «Классному руководителю от СППС», блог «Родительский клуб «Компетентность», блог-урок «Я спокоен… , или Уроки релаксации», блог методического объединения педагогов-психологов Фрунзенского района г. Минска.

Обращение к дистанционным практикам сопровождения педагогов позволяет спроектировать пространство психологической поддержки учителей, которое не требует личного обращения к педагогу-психологу и позволяет аккумулировать в свободном доступе большой объем психологических материалов, необходимых для работы. В частности, речь идет об интернет-пространстве психологической поддержки педагогов – блоге «Классному руководителю от СППС»(http://spps27.blogspot.com.by).

На главной странице блога в максимально полном и доступном виде представлена информация об актуальных городских и республиканских профилактических, информационно-образовательных акциях, информационных кампаниях, полезные и интересные материалы для классных руководителей. В сообщениях также даются ссылки на страницы блога «Профилактика» и «Классный час», где находится справочная информация, разработки классных часов и внеклассных мероприятий, видеоматериалы, памятки для оформления тематических стендов по заявленной тематике.

Основной проблемной зоной в сфере профессиональной деятельности педагога является необходимость поддерживать психологическую устойчивость. На странице «Сам себе психолог» педагогам предложены медитативные раскраски, советы и рекомендации «Антистрессовой аптечки», дающие возможность обрести поддержку, снять негативное эмоциональное напряжение и восстановить эмоциональное равновесие посредством различных приемов психологической разгрузки и самоанализа.

Использование материалов блога позволяет учителям выстраивать тонкое психолого-педагогическое сопровождение целостного развития формирующейся личности, ее социально-психологической адаптации в сочетании с самореализацией. Это достигается за счет свободного взаимодействия между равноправными и равнозначными субъектами образовательного процесса.

Блог «Родительский клуб «Компетентность» – это динамичная и действенная форма взаимодействия участников образовательного процесса: родителей и специалистов СППС. В работе с родителями интернет-клуб (http://roditeli27.blogspot.com.by) стал не только дополнительным каналом информирования и общения, но и средством привлечения к участию в воспитании детей. Страницы ресурса привлекают внимание к таким проблемам, как преодоление кризиса подросткового возраста и проблем социализации, формирование жизненных навыков, построение конструктивных отношений родителей с детьми.

В современном мире мы все находимся в ситуации острой нехватки времени. Если актуализировалась психологическая проблема у ребенка, а прийти на консультацию лично у родителей не получается, им предложен «виртуальный почтовый ящик доверия» – интернет-приемная. Также родители могут обратиться за консультацией к педагогу-психологу посредством Skype.

Даже при самых доверительных отношениях в семье родители иногда не могут вовремя заметить грозящую ребенку опасность в виртуальном пространстве и тем более не всегда знают как ее предотвратить.